СЛАВА ВЯЛІКАМУ КАСТРЫЧНІКУ!

У. І. Ленін на Краснай плошчы ў час святкавання другой гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.
Масква, 7 лістапада 1919 года. (Кінакадр з архіва ІМЛ).

Паўстагоддзя таму назад залп «Аўроры» абвясціў ўсяму свету нараджэнне новай эпохі. Хочацца зірнуць на пройдзены шлях, каб яшчэ лепш асэнсаваць здабытае, каб больш акрэслена ўбачыць вялікі заўтрашні дзень.

50 год! Кожны з іх насычаны велічнымі перамогамі, стваральнай працай савецкіх людзей у будаўніцтве новага грамадства.

Кашырская электрастанцыя... Днепрагэс... Камсамольск-на-Амуры... Магнітка... Брацкая ГЭС... Ад атсталасці, цемры, непісьменнасці пад кіраўніцтвам ленінскай партыі ўзнялася наша краіна да вяршынь найвялікшага прагрэсу ва ўсіх галінах жыцця і дзейнасці. І чым бліжэй мы да запаветнай мары — камунізма, тым шпарчэй нашы крокі наперад. Зараз гэтыя крокі мы лічым, вымяраем не толькі пяцігодкамі, гадамі, а месяцамі і нават днямі.

Увесь свет ускалыхнулі нядаўныя касмічныя перамогі: мяккая пасадка аўтаматычнай станцыі на Венеры, першая ў свеце аўтаматычная стыкоўка касмічных апаратаў на арбіце... Цудоўныя святочныя падарункі Кастрычніку! А колькі іх падрыхтаваў савецкі народ-Змагар, Стваральнік і Працаўнік! Яго поспехі, гістарычныя перамогі сталі магчымымі, дзякуючы подзвігу тых, хто ў сямнаццатым сказаў:

— Улада—Саветам!
— Зямля — сялянам!
— Фабрыкі, заводы—рабочым!
— Мір народам!

І знамянальна, што ў святочныя дні наш урад устанавіў новы ордэн—ордэн Кастрычніцкай рэвалюцыі.



...У святочным убранні Беларускі універсітэт імя У. І. Леніна. Справы і поспехі нашых вучоных, усяго калектыва ў юбілейным годзе высока адзначаны Радзімай — ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. За гады свайго існавання універсітэт падрыхтаваў звыш 22 тысяч высококваліфікаваных спецыялістаў, многія з якіх сталі вядомымі ў краіне партыйнымі і дзяржаўнымі работнікамі, дзеячамі навукі, літаратуры і мастацтва. Выдадзеныя навуковыя працы нашых вучоных складаюць даволі вялікую бібліятэку— 4 тысячы манаграфій і звыш 14 тысяч іншых даследаванняў.

Наш універсітэт стаў сапраўды інтэрнацыянальным. Разам з беларусамі ў яго светлых і прасторных аўдыторыях, багата абсталяваных лабараторыях займаюцца рускія, украінцы, літоўцы, татары, дзеці гераічнага В'етнама, пасланцы Кубы, краін Афрыкі і Азіі. У сваіх пісьмах у рэдакцыю кубінка Тэрэса да Коста Гомес, в'етнамец Нгуен ван Фан, манголец Енден Загд-Сурэн, афрыканец К. Страглер і многія іншыя замежныя студэнты сардэчна дзякуюць Савецкай краіне, нашым прафесарам, выкладчыкам за ўзорнае выкананне інтэрнацыянальнага доўгу перад працоўнымі свету.

Дарагія таварышы! Рэктарат, партыйны камітэт, мясцком, камітэт камсамола, прафком горача віншуюць вас з вялікім святам—50-годдзем Савецкай улады і жадаюць вам асабістага шчасця, выдатных поспехаў у вучобе, працы на карысць нашай Радзімы.

ЛАЎРЭАТЫ ЎСЕСАЮЗНАГА КОНКУРСУ

Амаль два гады па ўсёй савецкай краіне праходзіў фестываль самадзейнага мастацтва, прысвечаны 50-годдзю Вялікага Кастрычніка. Як і ў другіх рэспубліках, у Беларусі ён прадэманстраваў небывалы росквіт народных талентаў. У аглядах і конкурсах тут прыняло ўдзел звыш 23 тысяч гурткоў і калектываў, якія налічваюць у сваім складзе 361 тысячу спевакоў, танцораў, дэкламатараў.

Днямі журы Усесаюзнага фестывалю падвяло вынікі і адзначыла лепшыя калектывы і асобных выканаўцаў. 76 калектываў Беларусі ўзнагароджаны дыпломамі, а 107 чалавек сталі лаўрэатамі фестывалю.

Вялікую перамогу атрымалі самадзейныя артысты універсітэта. Студэнтка другога курса журфака С. Дубоўская ўдастоена Дыплома I ступені і медалі лаўрэата. Дыплом II ступені атрымаў калектыў Народнага аркестра народных інструментаў. А народная харавая капэла адзначана Дыпломам III ступені. Гэтым калектывам былі ўручаны памятныя медалі фестывалю.

Цікавая і разнастайная калекцыя ўзнагарод, якую мае наш ардэнаносны універсітэт, папоўнілася выдатнымі адзнакамі перамог.

Хочацца сардэчна павіншаваць пераможцаў Усесаюзнага фестывалю з поспехамі, з надыходзячым святам і пажадаць ім новых творчых дасягненняў.

С. СЯМЁНАЎ,
ст. інспектар Міністэрства культуры БССР, выпускнік універсітэта.

СУСТРАКАЮЧЫ СВЯТА...

Вялікімі поспехамі, высокім працоўным уздымам сустракаець пяцідзесяцігоддзе Краіны Саветаў дружны калектыў фізічнага факультэта. Сацыялістычныя абавязацельствы, узятыя факультэтам у гонар 50-годдзя Вялікага Кастрычніка, выкананы.

Многа зроблена ў юбілейным годзе па падрыхтоўцы кадраў вышэйшай кваліфікацыі.

● *Дванаццаць супрацоўнікаў факультэта абаранілі кандыдацкія дысертацыі, двое—доктарскія, 12 кандыдацкіх дысертацый прадстаўлена да абароны. Акрамя гэтага, да канца года будзе падрыхтавана яшчэ восем кандыдацкіх і дзве доктарскія дысертацыі. Гэты вялікі поспех фізічнага факультэта — падарунак Вялікаму Кастрычніку.*

● *Супрацоўнікамі факультэта здана і падрыхтавана да друку некалькі манаграфій і вучэбных дапаможнікаў. Дзве работы знаходзяцца ў выдавецтве «Вышэйшая школа», пяць—уключана ў тэматычны план выдавецтва універсітэта. Многа артыкулаў надрукавана ў навуковых часопісах.*

● *Значна перавыканан план па гаспадарча-дагаворных работах.*

● *У цяперашні час на фізічным факультэце займаецца 2286 студэнтаў, з іх 544 па сістэме вячэрняга навучання.*

● *Факультэт выпусціў у гэтым годзе 251 спецыяліста.*

● *573 студэнты прыняты на першы курс.*

● *Навучальны працэс забяспечваюць 14 кафедр. Імі падрыхтавана многа новых і цікавых спецкурсаў.*

М. ГАРАШЧУК.

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

№ 32 (684) ● 3 лістапада ● Цана 2 кап. Год выдання XX.

КАМУНІСТЫ

ГУТАРКА пойдзе аб тых, у каго няма яшчэ за плячыма ні подзвігаў, ні здзяйсненняў, а ёсць толькі прыкладна дваццацігадовы ўзрост, пачатак самастойнага жыцця, будучыня. Будучыня вялікая і радасная. Яны сустракаюць 50-годдзе Савецкай улады з ясным усведамленнем таго, што менавіта ім будаваць і дабудоўваць камунізм і жыць у гэтым цудоўным грамадстве. Уступаючы на самастойны шлях жыцця, яны бяруць працоўную эстафету ў старэйшых, каб панесці яе далей, абавязкова за межы XX стагоддзя і першага стагоддзя Вялікага Кастрычніка.

Нашы героі — студэнты філасофскага аддзялення гістарычнага факультэта, першага і другога курсаў. Іх пяць: Надзея Беляковіч, Фёдар Лазюк, Анатоль Злотнікаў, Інэса Салаўёва, Давід Ротман. Да універсітэта кожны з іх папрацаваў на прадпрыемстве, ва ўстанове.

Аднак хочацца расказаць аб маладых камуністах пасобку. Пачнем хоць бы з Надзі Беляковіч. Нарадзілася яна на Лагойшчыне ў сям'і лесніка і вырасла на ўлонні беларускай прыроды: сярод адвечнага шуму зялёнага лесу, плёскату блакітных рэчак і азёр, пад бясконцай празрыстасцю беларускага неба. Можа таму, Надзея і сама, як бярозка, такая стройная, беленькая і з вачыма такімі ж блакітнымі, як чэрвеньскае неба. Прырода, бацькі, школа і камсамол выхавалі Надзю разважнай, стрыманай, добрай, працавітай. Іменна ім мы абавязаны за тое, што, Надзя выдатная студэнтка, добрая сяброўка ў калектыве. Членам КПСС яна стала на вытворчасці, дзе працавала пасля заканчэння школы, а за адзін год знаходжання ва універсітэце — прызнаным важаком моладзі. Яе выбралі сакратаром партыйнай групы студэнтаў філасофскага аддзялення, а таксама членам бюро гістарычнага факультэта.

Адпраўляючы ва універсітэт сваю дачку, бацька Надзі Мікалай Беляковіч сказаў:

— Едзь, дачушка, вучыся, ды так, каб мы з маці ганарыліся табою.

Так, такім камуністам, такой студэнткай можна па-сапраўднаму ганарыцца.

Разам з Надзеяй на адным курсе, у адной групе вучыцца Фёдар Лазюк. Шлях у партыю і ва універсітэт у яго такі ж, як і ў Надзеі. Праўда, вучоба яму даецца крыху цяжэй. Але хлопец імкнецца падраўняцца і таксама стаць выдатнікам вучобы. Ёсць у Фёдара важнае даручэнне. Ён староста групы. Цяжка выконваць абавязкі старасты. Спачатку сябры касіліся на Федзю за «празмерную» прынцыповасць. А потым зразумелі, што менавіта такая прынцыповасць цэментуе калектыў і робіць яго згуртаваным. Цяпер на Федзю ніхто не крыўдуе. Наадварот, яму дзякуюць, бо яго прынцыповасць дапамагае ў вучобе. Цяжка склаўся лёс Анатоля Злотнікава. Слова «тата» ён ні-

(Заканчэнне на 3-й стар.)

Пад сцягам марксізма-ленінізма, пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі — наперад да новых перамог у барацьбе за перамогу камунізма ў нашай краіне!

(З Заклікаў ЦК КПСС).

ТАМУ, З ЧЫІМ ІМЕМ НАПЕРАД ІДЗЕМ

НА ГАЛОЎНЫМ НАПРАМКУ

Калектыў кафедры палітычнай эканоміі сустракае юбілей Савецкай улады значнымі поспехамі ў развіцці эканамічнай навукі. Толькі за апошні час тут абаронена чатыры кандыдацкія дысертацыі — Н. Заройскай, В. Ямеліным, В. Цімашэнка, П. Барсук. Тэмы гэтых дысертацый звязаны непасрэдна з канкрэтнымі праблемамі камуністычнага будаўніцтва. Усяго ў юбілейным годзе навуковая прадукцыя членаў кафедры складае больш 30 друкаваных аркушаў.

В. СІЛІН.

У гісторыі нашага ардэнаноснага універсітэта ёсць старонка асабліва дарагая кожнаму выкладчыку, студэнту. Мы маем на ўвазе сувязі яго заснавальнікаў і вучоных з Уладзімірам Ільічом Леніным.

28 студзеня 1919 года У. І. Ленін падпісвае дэкрэт Савета Народных Камісараў аб стварэнні дзяржаўных універсітэтаў у «азнаменаванне Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года, якая разняволіла працоўныя масы ад палітычнага, эканамічнага і духоўнага прыгнёту з боку маёмасных класаў і адкрыла ім шырокія дарогі да крыніц ведаў і культуры». Гэтае рашэнне Савецкага ўрада выклікала вялікую ўдзячнасць правадыру ў беларускага народа. Тут пачалася актыўная падрыхтоўка да арганізацыі універсітэцкага навучання. Ужо 24 лютага, менш чым праз месяц, ЦВК БССР пад старшынствам А. Ф. Мяснікова, прызнаўшы «вельмі пажаданым адкрыццё дзяржаўнага універсітэта ў Мінску», выдзеліў на гэтыя мэты мільён рублёў. Тут пачала працаваць спецыяльная камісія. Яшчэ праз месяц, 22 сакавіка, А. Ф. Мяснікоў, выступаючы на нарадзе ў Наркомасвеце РСФСР, дакладвае: «Дзяржаўны універсітэт у Мінску ўжо з'яўляецца фактам. У Мінску працуе камісія ў складзе сямі асоб... Універсітэт неабходны Беларусі па цэламу раду меркаванняў: эканамічнаму, тэхнічнаму і культурна-бытавому характару мясцовага жыцця».

Але здзяйсненне ленінскага дэкрэта на Беларусі было чаргова спынена белапольскай акупацыяй. Толькі ў ліпені 1921 года стварэнне універсітэта стала фактам. 11 ліпеня ў сталіцы нашай рэспублікі адбыўся ўрачысты сход грамадскасці, прысвечаны гэтай знамянальнай падзеі. Першае слова падзякі ўдзельнікі сходу накіравалі У. І. Леніну. Яны пісалі: «Адкрываючы ў дзень вызвалення Мінска—сталіцы Беларусі — Беларускі дзяржаўны універсітэт, урачысты сход, прысвечаны яго адкрыццю, ад імя партыйных, рабочых, культурных і грамадскіх сіл краю шле Вам, дарагі правадыр, сваё гарачае прывітанне».

31 кастрычніка 1921 года ў БДУ пачаліся рэгулярныя заняткі. Першы навучальны год, па словах рэктара універсітэта У. І. Пічэты, «быў асабліва цяжкі». Нягледзячы на гэта, было многа што зроблена. Вырашана было абагуліць набыты вопыт і дасягнутыя поспехі. Член праўлення універсітэта прафесар С. З. Кацэнбоген напісаў невялікую кнігу (40 старонак), названую проста і трапна—«Беларускі дзяржаўны універсітэт за 1921—22 акадэмічны год». Кніга была выдадзена, і прывезеныя ў ёй факты і лічбы здзівілі нават самых стойкіх аптымістаў.

Адрас: Масква, Леніну

І вось сваёй радасцю універсітэцкія таварышы спяшаюцца падзяліцца з самым дарагім для працоўных чалавекам—Леніным. У Маскву пасылаецца кніжка-справаздача, першы рапарт правадыру. На тытульным лісце надпіс: «Уладзіміру Ільічу Леніну ад Беларускага дзяржаўнага універсітэта». З гэтага часу такія своеасаблівыя рапарты універсітэта Ільічу становяцца традыцыйнымі.

У тым жа 1922 годзе наш універсітэт пасылае Леніну яшчэ дзве кніжкі з надпісам: «У. І. Леніну ад БДУ». Гэта першы і другі (№ 2—3) выпускі «Прац Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў Мінску».

Гэтыя, падкрэсліваем, своеасаблівыя справаздачы захоўваюцца ў асабістай бібліятэцы У. І. Леніна у Крамлі. Тут ёсць і іншыя кнігі вядучых вучоных нашага універсітэта. Сярод іх курс лекцый С. Я. Вальфсона, прачытаных у БДУ, «Дыялектычны матэрыялізм» (другое мінскае выданне, 1922 год). Дарэчы, гэта быў першы ў Савецкім Саюзе падручнік па марксісцка-ленінскай філасофіі. Побач на паліцы стаіць другая кніга прафесара—«Вялікі сацыяліст» (аб жыцці і дзейнасці Г. В. Пляханава).

Кнігі першага рэктара У. Пічэты, вядомага вучонага М. М. Нікольскага, «Нарысы беларускай літаратуры» прафесара М. А. Янчука, зборнік артыкулаў Франца Мерынга, перакладзеных беларускім мастацтвазнаўцам М. М. Шчакаціхіным, (уступны артыкул С. Я. Вальфсона)—вось далёка няпоўны пералік прац універсітэцкіх аўтараў з асабістай бібліятэкі У. І. Леніна.

І тут напрошваецца параўнанне. У першы год існавання універсітэта было напісана і выдадзена 2—3 кнігі, уключаючы справаздачу, і каля 20 артыкулаў. У гэтым, юбілейным годзе Савецкай улады ўжо выпушчана 600 навуковых прац, з іх 30 манаграфій і вучэбных дапаможнікаў, сотні артыкулаў па актуальных праблемах тэорыі і практыкі камуністычнага будаўніцтва апублікавана ў газетах і часопісах. А калі падлічыць усё створанае ў нашым універсітэце за гады яго існавання, то атрымаецца ўнушальная і высокакаштоўная бібліятэка—больш 4.000 манаграфій і звыш 14.000 іншых навуковых прац. І гэтая бібліятэка—адна з многіх дзелавых справаздач Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна 50-годдзю Савецкай улады, партыі, народу, справе Леніна.

М. РЭГІСТАНАЎ.

ВОРАГ НЕ ПРАЙШОЎ

Калі я іду па вуліцы, сустракаюся са студэнтамі і бачу шчаслівыя твары савецкіх людзей, мне чамусьці прыходзяць на ўспамін тыя далёкія гады рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, калі маім равеснікам прышлося са зброяй у руках ажыццяўляць рэвалюцыю і абараняць яе парамогу ад унутраных і знешніх ворагаў.

Я шчаслівы, што дажыў да 50-годдзя Вялікага Кастрычніка і змог убачыць сваімі вачамі вялікі плён рэвалюцыйных заваёў, шчаслівае і радаснае жыццё савецкіх людзей. А адстойваць рэвалюцыю было нялёгка. Памятаю, з якім энтузіязмам мы сустракалі рэвалюцыю на фронце. Наш полк адразу раздзяліўся на дзве часткі: на прыхільнікаў і ворагаў рэвалюцыі.

У ліку гарачых прыхільнікаў у хуткім часе я быў у Маскве і там уступіў у рады Чырвонай Гвардыі. Неўзабаве мяне выбралі камандзірам атрада. Пачаліся цяжкія баі. Наш атрад змагаўся пад Чарнігавам супроць белагвардзейцаў і атрымаў нямала бліскучых перамог.

А калі была створана Чырвоная Армія, я стаў намеснікам камандзіра 20-га Тульскага пяхотнага палка. У нашу задачу ўваходзіла не дапусціць Дзянікіна ў Тулу, не даць яму магчымасці наблізіцца да Масквы. Дзень і ноч грымелі баі. Барацьба была няроўнай. Вораг пераўзыходзіў нас і колькасцю салдат і ўзбраеннем. Але ў нас была другая перавага — рэвалюцыйны ўздым, высокі баявы дух.

У самы крытычны момант барацьбы я быў назначаны начальнікам Тульскага ўмацаванага раёна. 48 тысяч чырвонаармейцаў штык у штык сталі на шляху Дзянікіна. І вораг не прайшоў ні да Масквы, ні да Тулы.

У гады грамадзянскай вайны я не аднойчы сустракаўся з нашымі славутымі палкаводцамі Варашылавым, Цімашэнка, Фабрыцыусам і іншымі, змагаўся пад іх камандаваннем.

Баі грамадзянскай вайны—гэта падзеі даўно мінулых дзён. А мне давялося яшчэ прымаць актыўны ўдзел і ў баях з цёмнымі сіламі фашызма. І як я рад, што пралітая намі кроў была недарэмнай, што мы стварылі сацыялістычнае грамадства і паспяхова будуем камунізм.

Г. СПІРЫДОНАЎ,
асістэнт кафедры эксперыментальнай фізікі і фізічнай электронікі, удзельнік грамадзянскай вайны.

50 ШЛЯХАМ ПЕРАМОЖНЫМ

Адкрылася выстаўка

З ГЭТАЙ выстаўкі, бадай што, ні адзін наведвальнік не пойдзе раўнадушным. На выдатных здымках, выкананых цудоўным майстрам, удзельнікам шматлікіх рэспубліканскіх, саюзных і міжнародных выставак Д. Р. Прэсам, адлюстравана амаль пяцідзесяцігадовая гісторыя нашага універсітэта.

Тут вы пазнаёміцеся са стваральнікамі вну, убачыце самае першае памяшканне і зможаце параўнаць яго з сучаснымі, узнятымі ў вышыню карпусамі.

Вучоба, ад першых, уступных экзаменаў да выпускных, праца ў лабараторыях, творчыя пошукі і вынікі навуковых даследаванняў пройдуць перад вачыма наведвальнікаў выстаўкі.

Бясспрэчна, зацікавяць раздзелы: «Вучоныя на міжнароднай арэне», «Пашыраюцца нашы інтэрнацыянальныя сувязі».

Некалькі здымкаў з гэтай выстаўкі мы прапануем увазе нашых чытачоў.

Святочная выстаўка — выдатны падарунак юбілею Кастрычніка.

УНІВЕРСІТЭТ ДА 50-годдзя ВЯЛІКАГА КАСТРЫЧНІКА



Напярэдадні свята адзін з самых маладых вучоных універсітэта В. Д. Ткачоў паспяхова абараніў доктарскую дысертацыю.

Фота Д. ПРЭСА.



Шмат вучняў у прафесара Уладзіміра Гаўрылавіча Вафіядзі. Нястомны даследчык, выдатны педагог, чалавек разнастайных інтарэсаў, ён з ахвотай перадае свой вопыт і веды моладзі. На здымку: У. Г. Вафіядзі з аспірантамі.

КАМУНІСТЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

колі не вымаўляў, чуў толькі, з якой пяшчотай вымаўлялі яго другія дзеці. Генадзь Злотнікаў-бацька, зусім маладым загінуў на фронце ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Але сын Генадзя не быў сіратой. Анатоля выхавала Савецкая улада. І ў сваім раннім узросце юнак зразумеў, што ўсім, чаго ён дасягнуў і дасягне, абавязаны Савецкай уладзе, Камуністычнай партыі. Можа таму і звязаў свой лёс з Камуністычнай партыяй. За вучобу і грамадскую работу юнак упарта ўзяўся з першых дзён. Настойліва вывучае «Капітал» К. Маркса, матэматыку, гісторыю КПСС. Не менш добрасумленна адносіцца Анатоль і да грамадскіх даручэнняў. Дэканат гістфака задаволены яго работай у якасці старасты. Яго група адна з самых дысцыплінаваных на факультэце.

У той жа групе, дзе вучыцца Анатоль Злотнікаў, ёсць яшчэ два камуністы — Інэса Салаўёва і Давід Ротман. Інэса прыйшла ва універсітэт з вялікім багажом ведаў. Яна закончыла ў Віцебску двухгадовы вячэрні універсітэт марксізма-ленінізма. Цяпер мае намер глыбока вывучыць філасофію. Цікавасць да марксісцка-ленінскай тэорыі прабудзіў у Інэсы яе бацька Леў Салаўёў, стары камуніст, сакратар парткома аднаго з буйнейшых прадпрыемстваў Віцебска. Уступіўшы ў партыю, яна пайшла па яго дарозе.

І, нарэшце, некалькі слоў аб Давідзе Ротмане. Давід вырас у горадзе. Пасля сканчэння школы некалькі год працаваў. Цяпер студэнт. Вучыцца старанна. На лекцыях—уседь увага, на семінарах — актыўны прамоўца. Сваёй дысцыплінаванасцю, карэктнасцю ён добра ўплывае на акружаючых.

Мы коратка расказалі аб студэнтах—камуністах. На філасофскім аддзяленні іх толькі пяць, але яны з'яўляюцца сапраўднымі важакамі студэнцкай моладзі. Павіншуем-жа іх з 50-годдзем Вялікага Кастрычніка і пажадаем поспехаў у вучобе і жыцці, у здзяйсненні светлых планаў і задум.

У. КУЛАЖАНКА,
кандыдат эканамічных навук.



У 1921 годзе студэнты нашага універсітэта вялі практычныя заняткі ў двух невялікіх лабараторыях. Цяпер іх — каля двухсот.
На здымку: у лабараторыі на біялагічнай станцыі.

Фота Д. ПРЭСА.

ДЗЕНЬ ЗА ДНЁМ

Зусім нямнога часу аддзяляе нас ад вялікага свята — паўвекавога юбілею Савецкай улады.

Чым жыве універсітэт у гэтыя перадсвяточныя дні? Заглянем у вестыбюль галоўнага корпуса, пройдзем па калідорах, адчынім дзверы аўдыторый, спартыўных залаў. Навакол перадсвяточнае ажыўленне, барвовай чырванню, кветкамі упрыгожаны памяшканні. А студэнцкае жыццё, як і раней, напоўнена падзеямі. Самадзейныя артысты падрыхтавалі да Кастрычніцкіх урачыстасцей спектакль «Маладая гвардыя», прем'ера якога прайшла паспяхова.

Вялікую цікавасць выклікалі таварыскія спаборніцтвы па гімнастыцы паміж нашымі спартсменамі і гімнастамі Сафійскага універсітэта.

На факультэце журналістыкі прайшоў дыспут па кінафільму «Журналіст» Будучыя работнікі друку спрачаліся аб назначэнні сваёй цяжкай, але цікавай прафесіі.

Цеснае сяброўства даўно звязвае студэнтаў гістарычнага і хімічнага факультэтаў. Нядаўна «саперныкі прыроды»—хімікі сустракаліся са сваімі сябрамі на традыцыйным маладзёжнам вечары. Агітбрыгада філалагічнага факультэта была госцем у Інстытуце механізацыі і электрафікацыі сельскай гаспадаркі.

Кожны дзень ідуць побач праца і адпачынак.

А. АПЕЛЬ.

КРОЧЫЦЬ ЮБІЛЕЙ

ПРОМЕНЬ І СОНЦА

Перад намі старонкі 100-га пажоўклага нумару газеты «Савецкая Беларусь» ад 31 снежня 1920 года. Кароткія заметкі аб гаспадарчым адраджэнні рэспублікі пасля цяжкіх разбуральных войнаў, паведамленні Саветаў аб актыўнасці рабочых і сялян ва ўмацаванні сваіх органаў улады. Выклікае цікавасць артыкул «Промень знанья». Ён прысвечаны пытанням станаўлення вышэйшай адукацыі на Беларусі.

Аўтар з болем у сэрцы расказвае аб тым часе, калі навука «была адгароджана ад працоўных сямю пячацямі». І толькі пасля перамогі сацыялістычнай рэвалюцыі мары народа аб сваёй школе сталі здзяйсняцца. «Сонца заглянула ў наша аконца, — піша аўтар. — Яго праменні асвяцілі цёмныя халодныя куткі. Мацней забілася сэрца... Пачалося жыццё!».. І далей: «У сучасны момант мы стаім напярэдадні афіцыйнага адкрыцця дзяржаўнага універсітэта ў Мінску. З Масквы ўжо прыехала 12 прафесараў. Ужо пачаліся эпізадычныя лекцыі.

Моладзь цэлымі натоўпамі ідзе на гэтыя лекцыі... Зацікаўленасць бывае такой, што на працягу двух гадзін ніхто не заварушыцца, не загамоніць. Кожны стараецца не прапусціць ні аднаго слова. Да ўсякіх галадовак, якія прыходзілася пераносіць нашай моладзі, далучыўся вялікі навуковы голад...»

З таго часу, калі пісаліся гэтыя радкі, непазнавальна змянілася наша Беларусь. Цяпер у рэспубліцы ёсць свая Акадэмія навук, толькі вышэйшых навучальных устаноў — каля 30, дзесяткі навукова-даследчых інстытутаў і буйных лабараторый, сотні тэхнікумаў і тысячы школ. Па колькасці навучэнцаў у разліку на 1000 чалавек Беларусь даўно перагнала нават самыя развітыя капіталістычныя краіны. Толькі ў нашым універсітэце рознымі формамі навучання ахоплена каля 15 тысяч чалавек.

Промень, які асвяціў у семнаццатым цёмныя куткі нашага краю, як і ўсёй краіны, запалаў цяпер яркім сонцам.

С. БАРАДОЎСКІ,
студэнт-завочнік.

ГАРАЧЫЯ СЭРЦЫ

Дзяжурная сястра бясшумна прыадкрыла дзверы палаты, каб упэўніцца ў тым, што тут усё ў парадку, хацела ўжо ісці далей, але раптам заўважыла каля ложка аднаго хворага спазнішагася наведвальніка.

— Малады чалавек, — здзівілася яна, — я ж прасіла вас... Бацька перанёс цяжкую аперацыю, яму цяпер патрэбны спакой ды лякарствы. Толькі гэта!

— А я і прынёс яму самыя дзейсныя лякарствы—універсітэцкія навіны,—пачулася ў адказ.

Дзяўчына збянтэжылася і, калі хворы слабым, прыглушаным голасам папрасіў: «Яшчэ хвіліначку, сын праўду кажа —размова мне не пашкодзіць, тым больш аб універсітэце», **ціхенька** выйшла ў калідор.

І зноў пытанні:

— А як там на біяфаку? Не чуў, мо, новыя экспанаты з'явіліся ў музеі?.. Цаліннікі нічога не прывезлі? Шкада...

Адказваць прыходзілася прама, без хітрыкаў: па адной інтанацыі хворы пазнае, праўду сын кажа ці не.

Не, не можа Антон Канстанцінавіч Ціток супакоіцца, пакуль усё не выпытае. Ды як тут не цікавіцца, калі любімай працы аддана жыццё. Радасная ўсмешка разліваецца на бледным твары хворага, калі ў голасе сына чуецца клопат аб агульных поспехах, славе універсітэта.

— Ну ідзі, на лекцыю спознішся... Ідзі...

Сын выходзіць, а бацька закрывае вочы. Не, не ад стомленасці. Успамінаецца 1925 год. Вось такім жа прыгожым хлопцам, як сын, Валодзя, прыйшоў ён ва універсітэт. За плячыма былі франты першай сусветнай вайны, актыўны ўдзел у рэвалюцыі і грамадзянскай вайне, у прыватнасці, у падаўленні кранштадскага мяцяжа, баявыя паходы пад камандаваннем такіх легендарных палкаводцаў, як Ян Фабрыцыус, з якім быў блізка знаёмы...

Здаецца, нядаўна гэта было, а вось ужо і старасць у палон узяла, розныя хваробы адолелі. Ну, нічога! Паправімся —і зноў за работу.

Тры гады назад універсітэт урачыста адзначыў сямідзесяцігоддзе старшага лабаранта Антона Канстанцінавіча.

Семдзесят год, пара і адпачыць. Але ці можна ўседзець дома, калі рукі так і просяць працы, калі непакоіць думка, што яшчэ не ўсё перадаў сваім вучням. Ён ішоў у заалагічны музей проста глянуць, як там, і потым цэлымі днямі «лячыў» старыя чучалы птушак, звяроў, быў гідам студэнтаў, школьнікаў, дапамагаў праводзіць практыкумы.

Хвароба — непрадбачныя канікулы. Недарэчна! Не любіць Антон Канстанцінавіч канікулы. Мо таму, што іх у яго ніколі не было. Усе сорак год працы ва універсітэце. Вучань вядомага савецкага прэпаратара - таксідэрміста М. А. Коліна, ён стварыў сваю вялікую беларускую школу людзей, на жаль, яшчэ рэдкай прафесіі.

Сённяшні заалагічны музей нашага універсітэта з яго сотнямі і тысячамі экспанатаў, музей, якім захапляюцца вучоныя замежных краін, па сутнасці, гэта вынік працы Антона Канстанцінавіча Цітка. Прычым, справа тут, галоўным чынам, не ў паўнаце, разнастайнасці прадстаўленага жывёльнага свету, а ў здзіўляючай кожнага здольнасці праслаўленага майстра прадставіць прыроду такой, якой яна ёсць — велічнай, прыгожай, жыватворнай. Вось перад вамі прыгожыя драпежныя птушкі, знішчальнікі грызуноў .Яны засталіся такімі, як у момант нападу на сваю дабычу. Здаецца, і вочы мігцяць іскрамі, і крылы напружаны... А пярнаты вакаліст беларускіх лясоў— маленькі салавей, здаецца, вось-вось напоўніць залу звонкімі трэлямі.

Белавежскі зубр, мядзьведзь, лось, алень, дзікі і зайцы. ...Ды ці можна пералічыць усё? А разам з тым амаль усё гэта сабрана і апрацавана Антонам Канстанцінавічам і яго памочнікамі.

Ён пяшком, і не раз, абышоў усю Беларусь і стварыў цуд. Цуд, які захапляе, вучыць, кліча. Каля дзесяці тысяч чалавек штогод наведвае наш музей, і я не памыляюся, калі скажу, што пасля гэтага яны яшчэ больш пачынаюць любіць свой край, родныя мясціны, беражлівей адносіцца да таго, што дае нам маці-прырода.

І яшчэ. Мабыць, трэба мець вельмі вялікую душу, бачыць глыбей і далей, больш, чым іншыя, бязмежна любіць сваю справу, каб стварыць такі цуд. Тут прайшлі падрыхтоўку многія пакаленні студэнтаў, педагогаў-біёлагаў з усіх куткоў Беларусі. І не дзіўна, што ў шматлікіх школах, як ні ў адной другой рэспубліцы, вы сустрэнеце цікавыя куткі прыроды, свае музеі.

Кажуць, што вельмі добра, калі кожны настаўнік пауторыцца хоць бы ў адным са сваіх вучняў. А калі ў дзесяці, сотні?! Гэтым можа па праву ганарыцца Антон Канстанцінавіч.

Я сустракаў шмат вучняў універсітэцкага ветэрана. Але, мне здаецца, найбольш Антон Канстанцінавіч паўтарыўся ў сваім сыне. Памятаю: у сорак дзевятым годзе мы жылі ў інтэрнаце па Віцебскай вуліцы. У ім маленькі пакой мела сям'я Антона Канстанцінавіча Цітка. Яго сын Валодзя, цяпер Уладзімір Антонавіч—кандыдат навук—часта заглядваў да нас, першакурснікаў. Усіх ён здзіўляў сваёй зацікаўленасцю, ведамі, любоўю да роднай Беларусі і нейкім непаўторным дарам збліжацца з незнаёмымі людзьмі. Ён паспяхова закончыў гістарычны факультэт, і, яшчэ будучы студэнтам, захапіўся геаграфічным рэвалюцыйным мінулым рэспублікі. Так нарадзілася тэма кандыдацкай дысертацыі, якая абаронена ў мінулым годзе.

Здольны даследчык, выдатны педагог, ён карыстаецца, як і бацька, агульным аўтарытэтам ва універсітэце. Другі год запар выкладчыкі гістфака выбіраюць яго старшынёй прафбюро. Чалавек, вельмі заняты, Уладзімір Антонавіч, як і ў студэнцкія гады, знаходзіць час, каб адстойваць гонар факультэта на спартыўных спаборніцтвах, або пацягнуць за сабою ў паход у лес сівых прафесараў.

...Дзень на зыходзе. Закончыліся заняткі ў стацыянарнікаў. Хутка аўдыторыі запоўняць вячэрнікі. Уладзімір Антонавіч спяшаецца наведаць хворага бацьку ў бальніцы, расказаць яму аб перадсвяточных навінах... Антон Канстанцінавіч павінен разам з родным калектывам сустрэць слаўны юбілей Кастрычніка.

І. МІХАЙЛАЎ.

Дарога ў 20 год

Свежы нумар газеты.

Фота І. АСКІРКІ.

Дваццаць год назад, 7 лістапада, выйшаў першы нумар нашай шматтыражкі «Беларускі універсітэт». Газета працягвае развіваць традыцыі даваенных друкаваных органаў універсітэта, такіх як «Голас рабфакаўца». (1923—1931 гг.), «Белорусский студент» (1924 г.), «Шлях студэнцтва» (1927—1928 гг.), «Ленінскім шляхам» (1929—1930 гг.), «За бальшавіцкія кадры», («За пралетарскія кадры», «За ленінскія кадры») (1930—1940 гг.) і іншых. Яна змагалася і змагаецца за далейшае развіццё навуковых даследаванняў і іх усё большую сувязь з вытворчасцю, павышэнне ўзроўню падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі, паляпшэнне палітыка-выхаваўчай работы ў калектыве.

684 нумары газеты— гэта 684 старонкі слаўнай гісторыі нашага універсітэта, летапісу яго шматграннай паўсядзённай працы на карысць партыі, народу.

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта камсамола і прафкома, шматтыражка выступае арганізатарам многіх выдатных спраў, баявым прапагандыстам і агітатарам, аб'ядноўвае вакол сябе лепшыя творчыя сілы.

Першым рэдактарам нашай газеты ў пасляваенныя гады быў Л. С. Абэцэдарскі. Цяпер ён— доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі Беларусі. Яго змяніў студэнт Герой Савецкага Саюза А. А. Філімонаў. Цяпер — дацэнт кафедры гісторыі КПСС. У розныя гады рэдакцыю ўзначальвалі прафесар У. М. Сікорскі, дацэнты Р. В. Булацкі, М. Я. Цікоцкі, А. А. Волк, І. Я. Навуменка, старшы выкладчык В. І. Дубовік, кандыдаты навук У. А. Кулажанка, П. П. Сіліванчык, А. А. Лойка. У газеце пачыналі свой творчы шлях вядомыя цяпер пісьменнікі і журналісты: А. Зінін, В. Матвееў, Р. Акулаў, В. Шыцік, В. Міхайлаў, Б. Сачанка, В. Чанін, М. Аўрамчык, У. Мехаў і іншыя.

Зараз пры рэдакцыі працуе літаб'яднанне «Узлёт».

НЕЗАБЫЎНЫЯ ДНІ

ПЕРШАЯ ЗАМЕТКА

Мне, як і ўсім, хто прайшоў вышэйшую школу, ніколі не забыць студэнцкае жыццё. Пасля вайны яно было асабліва цяжкім: не хапала не толькі аўдыторый для заняткаў, інтэрнатаў, але нават падручнікаў, паперы. Вялікую работу, якую цяпер вядзе дапаможны персанал універсітэта, прыходзілася выконваць самім студэнтам, ва ўсім праяўляць ініцыятыву. Да таго ж, многія з нас закончылі школу да вайны, а на фронце некалі было «паўтараць пройдзенае». Вось і ўзнаўлялі забытае адначасова з вывучэннем новага матэрыяла. Адным словам, кожны час быў на ўліку.

І ўсе ж мы не былі ні «зубрыламі», ні людзьмі, якія толькі і ведалі кніжкі ды канспекты. Большасць студэнтаў актыўна ўдзельнічала ў грамадскай рабоце, сістэматычна выконвала даручэнні рэктарата, партыйнай, камсамольскай і прафсаюзнай арганізацый, дэканатаў.

Мне, аднаму з першых пасляваенных рэдактараў «Беларускага універсітэта», успамінаецца той памятны час (1948—1949 вучэбны год), калі разам з тагачаснымі студэнтамі А. Зініным, В. Матвеевым, Р. Акулавым, О. Ліўшыцам, Л. Мерсонам, В. Нехамкіным, Е. Капелянам, В. Шыцікам і іншымі прыходзілася «рабіць» універсітэцкую газету. Шматтыражка тады выходзіла адзін-два разы ў месяц. Яе асноўнымі карэспандэнтамі былі студэнты аддзялення журналістыкі і прадстаўнікі другіх факультэтаў.

Як бачна з падшыўкі і цяпер, артыкулы і карэспандэнцыі насілі баявы, прынцыповы характар, многія з іх станавіліся прадметам абмеркавання на пасяджэннях партыйнага бюро, камітэта камсамола, прафкома.

Пасля выхаду кожнага нумара газета ўсебакова абмяркоўвалася калектывам рэдкалегіі і студкораў. Гэта давала магчымасць не дапускаць памылак, своечасова ўносіць карэктывы ў план, ісці ў ногу з жыццём. Паўсядзённа работай рэдкалегіі кіравала партбюро. Не гледзячы на тое, што ў нас было нямала карэспандэнтаў, цяжкасцей таксама хапала. Успамінаецца выпуск газеты. Тады тыпаграфія знаходзілася ў падвальным памяшканні хімічнага факультэта—і цесна, і цёмна. Часта здаралася такое, што ў самы крытычны момант патухаў свет. Наборшчыкі, друкары адшуквалі нафтавыя капцілкі ці свечкі і прадаўжалі працу. Праўда, сяды-тады ўдавалася выкарыстоўваць для асвятлення тыпаграфіі акамулятары з аўтамашын.

А як быць з друкарнай машынай? Яе нафтай не падкруціш. Тады студэнты-журналісты збіраліся, як кажуць, па трывозе і ўручную «круцілі» весь тыраж.

Некаторыя нумары нам дапамагалі выпускаць тыпаграфіі Савета Міністраў БССР, Акадэміі навук, але нам не хацелася іх адрываць ад аснаўных задач, якія яны вырашалі таксама не ў вельмі спрыяльных умовах.

Прыемна адзначыць, што многія студэнты аддзялення журналістыкі, набываўшыя першы вопыт у нашай шматтыражцы, такія, як А. Зінін, В. Матвееў, Р. Акулаў і іншыя, цяпер сталі вядомымі журналістамі рэспублікі і краіны.

Напярэдадні пяцідзесяцігоддзя Кастрычніка газета «Беларускі універсітэт» адзначае свой юбілей—20 год працы. Сардэчна віншую калектыў рэдакцыі, студэнцкіх карэспандэнтаў са святам. Жадаю вам, дарагія таварышы, захоўваць і развіваць лепшыя традыцыі шматтыражкі, высока несці сцяг партыйнага друку, неаслабна працаваць над камуністычным выхаваннем моладзі і падрыхтоўкай ідэйна загартаваных, высококваліфікаваных спецыялістаў.

А. ФІЛІМОНАЎ,
дацэнт кафедры гісторыі КПСС, Герой Савецкага Саюза.

На гэтых здымках—студэнты і выкладчыкі самага маладога факультэта універсітэта—журналістыкі.

Наш карэспандэнт І. Аскірка сфатаграфаваў іх у час дыспута па кінафільму Сяргея Герасімава «Журналіст».

Спрэчкі, дыспуты — іх многа ў будучых газетчыкаў, супрацоўнікаў выдавецтваў. Яны дапамагаюць глыбей пранікнуць у таіны сваёй нялёгкай прафесіі, асведаміць абавязкі агітатараў, прапагандыстаў і арганізатараў .

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ, супрацоўнікі газеты «Беларускі універсітэт», чытачы! Рэктарат, партком, мясцком, камітэт камсамола, прафком Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна горача віншуе вас з 20-годдзем газеты, жадае вам выдатных поспехаў у рабоце і асабістага шчасця.

Слаўны шлях прайшла газета. Заўсёды з'яўляючыся верным памочнікам рэктарата, парткома, мясцкома, камітэта камсамола і прафкома, яна нястомна дапамагала студэнтам авалодваць ведамі, прапагандыравала на сваіх старонках навуковыя дасягненні вучоных універсітэта, горача падтрымлівала ўсё новае, што з'яўлялася ў нашым шматгранным жыцці.

Няхай заўсёды газета «Беларускі універсітэт» будзе нястомным прапагандыстам ведаў, арганізатарам слаўных спраў!

Рэктарат, партком, мясцком, камітэт камсамола і прафком.

СТАРОНКІ ЛЕТАПІСУ

Перагортваць старонкі шматтыражкі — не толькі прабегчы вачыма, дзе напісана чорным па белым. Гэта шчасце быць сведкам неадольнага росту ўсяго універсітэта, яго шматтысячнага калектыва — студэнтаў, вучоных, супрацоўнікаў.

На старонках — матэрыялы па самых актуальных пытаннях жыцця.

Цяпер, калі мы глядзім з небывалай вяршыні дасягнутага за 50 год, адны праблемы і факты, якія выстаўляла газета чытачу, прымушаюць задумацца, іншыя не выклікаюць здзіўлення, але ўсе яны разам з гэтым радуюць нас і па-ранейшаму клічуць наперад.

Хіба могуць здзівіць вось гэтыя радкі?

«Цікавы і змястоўны даклад на тэму «Мова дзеда Талаша па творы Я. Коласа «Дрыгва» зрабіў студэнт IV курса філалагічнага факультэта Л. Шакун на студэнцкай навуковай канферэнцыі».

Гэта было ў 1948 годзе. Цяпер Леў Міхайлавіч Шакун — вядомы лінгвіст, доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры беларускай мовы нашага універсітэта.

У 27 нумары газеты за 1949 год быў змешчан артыкул «Выдатны студэнт». У ім расказвалася аб былым начальніку штаба аднаго з атрадаў партызанскай брыгады імя Канстанціна Заслонава студэнце IV курса філфака М. Крукоўскім.

Змяніўшы зброю на пяро і падручнікі, ён працягваў барацьбу за веды, наб і далей прыносіць карысць Радзіме. Чатыры гады вучыўся толькі на выдатна. Персанальны стыпендыят.

Аўтар артыкула звяртае ўвагу на тое, што М. Крукоўскі праяўляе вялікую зацікаўленасць да навуковых даследаванняў.

Днямі мы сустрэліся з М. І. Крукоўскім, доктарам філасофскіх навук. Ён паведаміў нам, што за прайшоўшы час надрукаваў звыш дзесятка прац па мовазнаўству і марксісцка-ленінскай эстэтыцы...

У гэтым жа нумары газеты мы знаходзім цікавы факт і са студэнцкага жыцця. Даведваемся, аб тым, што студэнты другога курса аддзялення філасофіі вялі карысную перапіску з прэзідэнтам Усесаюзнай Акадэміі сельскагаспадарчых навук імя У. І. Леніна Т. Д. Лысенкам і задавалі яму пытанні, падобныя вось на гэта: «Ці існуе сувязь паміж мічурынскім разуменнем спадчыннасці і яе зменлівасцю і адмаўленнем унутрывідавой канкурэнцыі?»

Чым больш мы ўнікаем у сутнасць матэрыялаў і фактаў, якія змяшчаў «Беларускі універсітэт», тым больш упэўніваемся ў вернасці і адданасці гэтай газеты справе камуністычнага будаўніцтва.

І. КОРЗУН.

Зак. 1716. АТ 13689 Наш адрас: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. № 106. Тэлефон Б-2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда»

Рэдактар М. ІОСЬКА.